САВЕЦКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

ПРАЗ тры дні — зноў свята, свята савецкай дэмакратыі. Ужо стала традыцыяй сустракаць знамянальныя даты поспехамі ў працы, вучобе. Радуе Радзіму калектыў нашага ардэнаноснага універсітэта. Толькі за апошні месяц тут абаронена чатыры дысертацыі, выйшаў у свет шэраг буйных манаграфій, літаратурных твораў. Такія факты можна прывесці па ўсіх галінах жыцця і дзейнасці універсітэта. Аб іх падрабязна расказваецца ў лекцыях і гутарках, насценгазетах, на ўрачыстых вечарах, прысвечаных Дню Канстытуцыі.

Дзякуючы перамозе Савецкай улады, дзеці рабочых і сялян Беларусі ўпершыню атрымалі доступ да ведаў, сакрэтаў навукі і тэхнікі. Сорак шэсць год назад адчынілі свае дзверы і наш універсітэт, створаны па ленінскаму дэкрэту. Тады ў ім займалася крыху больш тысячы чалавек, а цяпер — 15 тысяч! Дзесяткі прафесараў і сотні кандыдатаў навук перадаюць свае веды і вопыт моладзі. Здзіўляючы сваёй прыгажосцю, велічны універсітэцкі гарадок з кожным годам расце і пашыраецца. За ўсе гэтыя клопаты мы ўдзячны партыі і Радзіме.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГОД ВЫДАННЯ XXI

1967 г.

1 снежня

ПЯТНІЦА

№ 35 (687)

ЦАНА 2 КАП.

ВЫХАВАННЕ СТАЛАСЦІ

ЛЕТАСЬ давялося мне пытаннях і заўсёды выходзілі пераможцамі. давалі адпор любым правакацыйным падкопам. Прычым ўсё гэта — аргументавана, з вялікай перакананасцю.

Безумоўна, не раптам, думала я, сталі нашы юнакі такімі стойкімі і палкімі ідэйнымі барацьбітамі. Безумоўна, тут выявіўся ўвесь лад нашага савецкага жыцця, ўся атмасфера краіны, гады, праведзеныя ў школе, камсамоле. Дала аддачу і тая вялікая карпатлівая праца, якую праводзім мы ва універсітэце, выхоўваючы не толькі добрых спецыялістаў, але і ідэйна стойкіх людзей.

Па заканчэнні вну ўчарашні студэнт уліваецца ў калектыў. І як важна, каб ён прынёс туды разам з прафесійным уменнем вялікі запас палітычных ведаў, моцную ідэйную загартоўку. Ад нас, выкладчыкаў, ад партыйнай і камсамольскай арганізацый залежыць, ці забяспечым мы яго такімі рог вну, малады чалавек з першых крокаў пачынаў прылучацца да неацэннай ідэйнай скарбніцы марксізма-ленінізма.

Канешне, вядучая роля ў гэтым належыць грамадскім навукам. Выкладчык філасофіі ці гісторыі партыі, палітэканоміі ці навуковага камунізма знаходзіцца на пярэднім краі ідэйна-выхаваўчай працы. Многае значыць, наколькі глыбока, грунтоўна, свабодна ён валодае матэрыялам, ці ўмее ярка і запамінальна выкласці яго, наладзіць падчас лекцыі альбо семінара жывы кантакт са студэнтамі, знайсці шлях не толькі да розуму, але і да сэрца сваіх слухачоў, развіць цікавасць да рэвалюцыйнай тэорыі. Усё гэта важныя ўмовы паспяховага выкладання. Каб ажыццявіць іх, як падкрэсліваецца ў нядаўняй Пастанове ЦК КПСС аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнні іх ролі ў камуністычным будаўніцтве, «неабходна пастаянна падтрымліваць у калектывах вучоных і выкладчыкаў атмасферу высокай адказнасці, развіваць іх творчую актыўнасць і узаемную патрабавальнасць...»

У стварэнні менавіта такой атмасферы бачыць далейшую сваю мэту партыйная арганізацыя універсітэта. На кафедрах грамадскіх навук у нас стала правілам рэгулярна абмяркоўваць тэксты лекцый. Праводзяцца адкрытыя лекцыі, якія пасля абмяркоўваюцца на пасяджэннях кафедр. Сістэматычна пытанні выкладання грамадскіх навук мы разглядаем на пасяджэннях партыйнага камітэта універсітэта і партыйных бюро факультэтаў. Задача абмеркаванняў— павышэнне ідэйнага ўзроўню лекцый і семінараў, барацьба з казёншчынай, начытніцтвам. Партком праяўляе пастаянныя клопаты аб творчай вучобе саміх выкладчыкаў, аб перадачы вопыту лепшых з іх.

(Працяг на 3-й стар.).

ПЕРШАЕ МЕСЦА — НАШАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

На працягу цэлага года ў рэспубліцы працягваўся агляд-конкурс бібліятэк вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў, прысвечаны 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Актыўны ўдзел у аглядзе прыняў калектыў старэйшай у Беларусі універсітэцкай бібліятэкі. Яе супрацоўнікі ўзялі на сябе абавязацельствы заняць пачэснае месца сярод бібліятэк рэспублікі ў юбілейным годзе.

І вось падведзены вынікі агляду. Як і меркавалася, першае месца прысуджана бібліятэцы нашага ардэнаноснага універсітэта.

СЕСІЯ: ЗНОЎ СУДЗІЦЬ БУДУ СТРОГА

У час мінулай сесіі гістфак напаткала бяда. Інакш і не скажаш: звыш паловы студэнтаў на экзаменах атрымалі тройкі, а дваццаць працэнтаў — нездавальняючыя адзнакі. Асабліва «вылучыліся» першакурснікі, многія з якіх назаўсёды развіталіся са сваёй «альма-матэр», як яны называлі універсітэт.

На гістфаку? — здзіўляліся філолагі і юрысты, біёлагі і хімікі... На факультэце, дзе такі вопытны і высокакваліфікаваны калектыў прафесараў і выкладчыкаў, такая баявая партыйная арганізацыя! Так, цяжка было паверыць, і ўсё ж няшчасце заставалася няшчасцем.

Аб памерах і прычынах гэтага здарэння гаварылася і пісалася многа. Але на самім гістфаку, па праўдзе кажучы, гаварылася менш за ўсё. Тут было не да размоў: тут працавалі. У чытача можа скласціся ўражанне, што дасюль гісторыкі-выкладчыкі былі непатрабавальнымі, а пасля дажджу, як кажуць, схапянуліся. Не, гэта не так. Прычыны ў іншым, і на факультэце ў іх хутка разабраліся і прыняліся за ліквідаванне. Кароткі артыкул не дазваляе расказаць аб усіх праведзеных мерапрыемствах, справах партыйных і камсамольскіх, арганізацыйных і палітычных, па-сапраўднаму разнастайнай напружанай рабоце дэканата і кафедраў, лабараторый і прафбюро. Адзін іх пералік заняў бы многа месца. І ўсе яны былі накіраваны да адной мэты — дапамагчы адстаючым студэнтам, прымусіць узяцца за розум гультаёў, адным словам, забяспечыць той рытм у паўсядзённай рабоце ўсіх студэнтаў, без якога не можа вырасці высокакваліфікаваны спецыяліст. Увядзенне калоквіумаў па новых прадметах, павышэнне ролі іншых форм, строгі кантроль за паляпшэннем вучэбнага працэсу ўцэлым, высокая патрабавальнасць да тых, хто парушае дысцыпліну, абыякава адносіцца да сваіх абавязкаў, у спалучэнні з мерамі заахвочвання, шырокай узаемадапамогай за ўсіх групах і на курсах прынеслі ўжо станоўчыя вынікі.

Аб гэтых выніках гаварылася на адкрытым партыйным сходзе, які адбыўся ў аўторак. Гаварылася толькі для таго, каб больш адметна падкрэсліць тыя змены, якія адбыліся на факультэце за кароткі час; большасць студэнтаў паказвае глыбокія веды на практычных занятках, добра засвойвае лекцыйны матэрыял. Гісторыкі аказаліся вядучымі ва універсітэце на ўсіх этапах агляду студэнцкіх навуковых работ, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады (з 36 прац гісторыкаў на рэспубліканскім конкурсе 25 аднесены да першай катэгорыі, 17 рэкамендаваны на Усесаюзны заключны тур)... Але паўтараю: аб усіх гэтых і іншых поспехах гаварылася толькі для таго, каб надаць больш энергіі і ўпэўненасці студэнтам, каб прыцягнуць увагу да тых недахопаў, якія яшчэ існуюць і якія патрэбна ліквідаваць, каб да экзаменацыйнай сесіі падысці з вялікім багажом ведаў.

Неабходна адзначыць, што партыйнае бюро (сакратар А. І. Кажушкоў) вельмі старанна падрыхтавала сход; новы склад бюро вытрымаў экзамен, не перабольшваючы, на выдатна. Па сутнасці сход пачаўся яшчэ да яго адкрыцця. Ля «Маланкі», спецыяльна выпушчанай у той дзень і прысвечанай паспяховасці студэнтаў у вучобе, задоўга да сходу пачаліся дзелавыя спрэчкі. Масла ў агонь падліў дакладчык—намеснік дэкана А. П. Ігнаценка. Не ў аднаго студэнта гарэлі шчокі: крытыка брала за жывое. Так, даклад быў па-баявому крытычны, можа, нават завельмі. Але нічога: крытыка яшчэ нікому не перашкаджала. Я думаю, што Саладкова, Рудак, Паўлава, Жмуроўскі і многія іншыя студэнты ў тую ноч спалі неспакойна: мучыў сорам перад сваімі таварышамі, перад выкладчыкамі. Сход прад'явіў павышаную патрэбзвальнасць да камсамольцаў, камуністаў, усіх актывістаў.

Прафесар А. М. Палетыка, сакратар камсамольскага бюро трэцяга курса А. Кузняцоў, староста другога курса В. Кушнер, камуніст-першакурснік Д. Ротман, выкладчык У. Н. Сідарцоў, выпускнік І. Пятроўскі, студэнт другога курса аддзялення філасофіі Ю. Шынкар, якія выступілі ў спрэчках і крытыкавалі недахопы не менш, чым дакладчык, унеслі шэраг слушных прапаноў, каб сесія не застала ні аднаго студэнта непадрыхтаваным.

Сход падтрымаў ужо не парады, а канкрэтныя планы па арганізацыі сустрэч першакурснікаў з выпускнікамі, будучых экзаменатараў са студэнтамі ўсіх курсаў па пытаннях сесіі, па падрыхтоўцы новых кніжных выстаўвак, спісаў рэкамендаванай літаратуры і г. д.

І тут я зноў вяртаюся да спрэчак. Сход закончыўся, прынята адпаведная праграма дзейнасці (не дзіўна, што рэзалюцыя аказалася параўнаўча кароткай), а спрэчкі працягваліся ў калідоры, аўдыторыях. І справы, і гэты своечасовы дзелавы форум усяго факультэта сведчаць аб тым, што гісторыкі з поўным узбраеннем ідуць да экзаменаў, бо сесія, як і заўсёды, будзе судзіць строга. А інакш і быць не можа. Бачна, што зрухі ў жыцці гістфака — гэта не кароткатэрміновая кампанія. Дык шпарчэй і цвярдзей крок, гісторыкі!

А. РУСАК,
наш спецкор.

На фінішнай прамой

У выпускнікоў самага маладога факультэта — журналістыкі — пачалася сесія. Паспяхова справіўшыся з залікамі, у мінулую сераду яны здалі першы экзамен сваёй апошняй сесіі па курсу «Нарыс і фельетон». Экзаменатар дацэнт Е. Л. Бондарава, трэба сказаць, вельмі патрабавальная, засталася задаволенай многімі адказамі.

С. КРЫНІЦКІ.

Ніна Ягоўкіна і Люда Зелікава — студэнткі-першакурсніцы філалагічнага факультэта. Усяго тры месяцы назад яны пераступілі парог універсітэта. Да першай іх сесіі — яшчэ меншы адрэзак часу. І не дзіўна, што наш фотакарэспандэнт І. Аскірка застаў Ніну і Люду ў гукатэхнічным кабінеце, дзе яны вывучалі замежную мову.

ТАК ТРЫМАЦЬ, ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ!

Наш універсітэт — лепшы ў краіне па арганізацыі інтэрнацыянальнай работы. Такі вывад зроблены Агульнасаюзным Саветам па справах замежных студэнтаў і Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР пры падвядзенні вынікаў агляду, прысвечанаму 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. У сувязі з гэтым універсітэт узнагароджан Ганаровай Граматай.

Ніжэй друкуюцца матэрыялы аб вопыце вучэбнай і выхаваўчай работы сярод замежных студэнтаў.

Тэлеграма з Масквы

РЭКТАРУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ТАВ. СЕЎЧАНКУ А. Н.

Агульнасаюзным Саветам па справах замежных навучэнцаў і Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР Ваш універсітэт прызнаны лепшым у арганізацыі інтэрнацыянальнай работы па выніках агляду, праведзенага ў сувязі з 50-годдзем Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Універсітэт узнагароджан Ганаровай Граматай.

Віншуем калектыў універсітэта з перамогай у аглядзе і святам 50-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Старшыня Агульнасаюзнага Савета па справах замежных студэнтаў, Міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР
В. ЕЛЮЦІН.

КАЛІ ПОБАЧ СЯБРЫ

Вечар... У большасці студэнтаў закончыліся заняткі, але ў гэтых аўдыторыях чуваць галасы. Уваходжу ў адну, другую, трэцюю. Над кнігамі схіліліся замежныя студэнты. Яны рыхтуюць дамашнія заданні. Адны чытаюць тэксты, іншыя вывучаюць новыя словы і словазлучэнні. Некаторыя пішуць пісьмы дамоў. Разгаварыліся. Аказалася, што для замежных студэнтаў руская мова цяжкая таму, што яна грунтуецца на доўгіх словах і даволі складанай структуры сказаў. Цяперашнія студэнты зайздросцяць сваім сябрам, якія ўжо паспелі закончыць падрыхтоўчы факультэт і добра размаўляюць па-руску. Але і яны ўпэўнены, што пры дапамозе выкладчыкаў змогуць авалодаць гэтай цяжкай мовай.

Выкладчыкаў кафедры рускай мовы можна сустрэць на факультэце не толькі ў час заняткаў, але і вечарам, і нават у выхадны дзень. Яны не шкадуюць сіл для таго, каб дапамагчы сваім выхаванцам авалодаць мовай, пазнаёміць іх з жыццём савецкага народа.

Кафедра была створана шэсць гадоў назад. Не маючы ніякіх вучэбных і метадычных дапаможнікаў, а таксама і вопыта работы з замежнымі студэнтамі, выкладчыкі з энергіяй узяліся за справу, стварылі неабходныя дапаможнікі і метадычныя распрацоўкі, вучыліся самі і вучылі студэнтаў. І хоць першы навучальны год працягваўся сем месяцаў, студэнты былі добра падрыхтаваны для далейшай вучобы ў вну нашай краіны і цяпер ужо працуюць па сваіх спецыяльнасцях на сваёй Радзіме.

Ішлі гады. Кафедра расла. Новыя выкладчыкі ўсё больш набіраліся вопыту ў сваіх калег. Але і старэйшыя не спыняліся на дасягнутым. Яны ўдасканальвалі методыку выкладання, шукалі новыя формы і метады працы, павышалі сваё педагагічнае майстэрства. Многія выкладчыкі здалі кандыдацкі мінімум па філасофіі і замежнай мове, а старшы выкладчык В. В. Рэвіцкі абараніў кандыдацкую дысертацыю. Творча працуюць старшыя выкладчыкі Т. І. Анісімава, О. П. Вадэйка, А. А. Рудэнка, Л. А. Міцкевіч, А. В. Самаль, Т. Л. Пятровіч, Т. І. Ліпніцкая, Л. Ф. Сакавец, выкладчыкі А. В. Саннікава, Э. М. Мазуркевіч, Р. В. Ульянка і іншыя. Яны разнастайваюць формы і метады выкладання рускай мовы замежным студэнтам, дабіваюцца глыбокіх ведаў, многа ўвагі ўдзяляюць індывідуальнай рабоце з моладдзю, стварэнню адзінага працаздольнага калектыва.

На ўроках рускай мовы замежныя студэнты знаёмяцца з дасягненнямі Савецкага Саюза ў галіне навукі, тэхнікі і культуры. Аналізуючы тэксты, такія як «Атамная энергія — на дабрабыт народа», «Этапы вялікага шляху», «Мы народжаны, каб казку зрабіць быллю», «Я — савецкі», «Лёс чалавека», «З успамінаў» і іншыя, арганізуюць экскурсіі на заводы, фабрыкі і ў музеі Мінска, выкладчыкі ўмела актывізуюць слоўнікавы запас студэнтаў, прыцягваюць іх да дыскусій, паказваюць высокую свядомасць савецкіх людзей, выхоўваюць у студэнтаў сяброўскія адносіны да нашай краіны. І не дзіўна, што замежныя юнакі і дзяўчаты шчыра дзякуюць нашым выкладчыкам. Выязджаючы на вучобу ў іншыя гарады, яны працягваюць пісаць ім цёплыя, сардэчныя пісьмы.

З. КАКОШНІКАВА,
нам. загадчыка кафедры рускай мовы.

На здымку: З. Какошнікава прымае экзамен.

ВЕДАЦЬ КОЖНАГА

Работа з замежнымі студэнтамі асабліва складаная і цяжкая. Справа ў тым, што на падрыхтоўчы факультэт прыязджаюць людзі з устойлівымі рысамі характару, са сваімі маральнымі звычкамі, палітычнымі поглядамі. Ды і нацыянальны адбітак адчуваецца. Але і гэта не ўсё. Для выкладчыка вельмі важна ўлічваць узровень ведаў студэнтаў па таму ці іншаму прадмету.

Вось мы і стараемся з першых дзён вучобы блізка пазнаёміцца з кожным сваім выхаванцам, даведацца аб ім як мага больш. На аснове гэтага і будуем сваю працу: адным дапамагаем засвоіць упушчаныя раздзелы навукі, іншым — хутчэй пазнаёміцца з тэрміналогіяй прадмета, навучыцца лагічна думаць. Усе сродкі выкарыстоўваюцца для таго, каб сфарміраваць у моладзі матэрыялістычныя погляды.

З. СЕНЬКО,
выкладчык фізікі падрыхтоўчага факультэта.

«ДРУЖБА» ДАПАМАГАЕ ЎСІМ

Ужо сёмы год замежныя студэнты, якія вучацца ў нашым універсітэце, выпускаюць сваю насценгазету «Дружба». У ёй яны расказваюць шмат цікавага аб сваіх краінах. Гэтыя весткі па геаграфіі, гісторыі, нацыянальных звычаях дапамагаюць ім не толькі лепш ведаць адзін аднаго, але і выкарыстоўваюцца нашымі студэнтамі і выкладчыкамі. Асабліва гэта датычыцца спецвыпускаў, прысвечаных асобным краінам. Разам з тым «Дружба» — гэта трыбуна выкладання сваіх думак аб міжнародных падзеях, аб адносінах да таго ці іншага факта сучаснай гісторыі. З поўным правам можна сказаць, што за гэтыя гады газета стала школай выхавання прагрэсіўна - дэмакратычнага палітычнага светапогляду замежных студэнтаў.

Замежныя студэнты сістэматычна друкуюць цікавыя матэрыялы аб Савецкім Саюзе. Іх уражанні сведчаць, што іх выхоўваюць не толькі нашы выкладчыкі, студэнты, але і ўся наша сацыялістычная рэчаіснасць.

«Дружба» не толькі дапамагае ўмацоўваць дружбу замежных студэнтаў і іх сяброўскія сувязі з нашымі студэнтамі, школьнікамі, рабочымі, але і дапамагае ў вучобе.

Э. МАЗУРКЕВІЧ,
рэдактар насценгазеты «Дружба», выкладчык рускай мовы падрыхтоўчага факультэта.

АД ПРОСТАГА — ДА СКЛАДАНАГА

На першых занятках па гісторыі КПСС на першым курсе хімічнага факультэта я заўважыла, што студэнты з Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам адчуваюць некаторыя цяжкасці. Пасля лекцый падышла да іх, каб бліжэй пазнаёміцца, выявіць, што перашкаджала ім зразумець сэнс лекцыі. І тут выявілася галоўная прычына — слабае веданне рускай мовы.

Прышлося задумацца, што рабіць: агульныя лекцыі прыносілі гэтым студэнтам мала карысці. Гэтае пытанне абмяркоўвала партбюро факультэта. Мне было даручана арганізаваць індывідуальныя заняткі па вывучэнню гісторыі КПСС.

Пачала з таго, што дамовілася з в'етнамскімі студэнтамі аб абавязковым наведванні агульных лекцый па гісторыі КПСС, каб яны больш маглі слухаць рускую гутарковую мову, і аб індывідуальных занятках па дзве гадзіны ў тыдзень. Прыдбалі для ўсіх падручнікі па гісторыі КПСС. І, здавалася, усё пойдзе на лад. Але толькі здавалася: цяжкасці былі яшчэ наперадзе. Прыйшла на першыя заняткі. Расказваю, што дасць ім вывучэнне курса гісторыі КПСС, але адчуваю, што мяне слухачы не разумеюць. Спрабую гаварыць як можна прасцей, больш выразна. Эфекта ж — ніякага: не разумеюць. Што рабіць? Пачынаем займацца рускай мовай па падручніку гісторыі КПСС. На дапамогу прыходзіць і выкладчык-мовавед, які паралельна са мной дае заданне таксама па падручніку гісторыі КПСС. Месяцы тры-чатыры займаліся так: студэнты па чарзе чыталі, пыталі незразумелыя словы, выпісвалі іх. Тое, што чыталася, задавала падрыхтаваць дома. На наступных занятках крыху расказвала сама, зварочваючы ўвагу на тое ці іншае пытанне і карыстаючыся наборам слоў з тэксту, які студэнты рыхтавалі дома. Затым крыху апытвала, каб прывіць навыкі гутарковай мовы.

Пазней перайшлі да заняткаў па тыпу ўрочнай сістэмы сярэдняй школы: пытаю — растлумачваю — пытаю. Так займаліся дадатковыя гадзін 60. І агульная праца прынесла свае першыя плады. Калі на пачатку заняткаў усе пытанні датычыліся рускай мовы, то ў канцы навучальнага года студэнты прасілі растлумачыць аграрную і нацыянальную праграмы нашай партыі, сутнасць двоеўладства, асобныя палажэнні ленінскіх прац і г. д. Экзамен яны здалі паспяхова: Дзінь Тхі Кук атрымала «выдатна», Чан Кім Монг, Нгуен Хыу Чы, До Мань Ханг, Нгуен Тхі Нгы — «добра».

Зараз мы прадаўжаем нашы заняткі, ёсць і цяпер некаторыя цяжкасці, але іншага характару. Мяне радуюць поспехі студэнтаў з ДРВ. Яны разумеюць мяне і тады, калі з усімі студэнтамі слухаюць агульныя лекцыі, канспектуюць іх. А пытанняў, як і раней, шмат на дадатковых занятках, але яны ўжо, галоўным чынам, гістарычнага характару.

Гэта, безумоўна, поспех — вынік працавітасці, напорыстасці, руплівасці саміх студэнтаў з Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.

І мне прыемна, што напярэдадні 50-годдзя Вялікага Кастрычніка мая сціплая праца адзначана значком Таварыства в'етнама-савецкай дружбы і служыць справе умацавання дружбы паміж народамі Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам і Савецкага Саюза.

Г. МАРЦІНОВІЧ,
старшы выкладчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна, кандыдат гістарычных навук.

ТЫ МАЛАДЗЕЦ, АНТОНІО

Экзамены. Якая гэта хвалюючая падзея! На экзаменах не бывае раўнадушных. Падводзяцца вынікі работы за год. Справаздачу даюць не толькі студэнты, але і выкладчыкі. За год нялёгкай, але цікавай працы студэнты пазнаюць многа новых з'яў, законаў, адкрыццяў, але працэс пазнання ідзе на рускай мове, якую студэнты толькі пачынаюць засвойваць. Гэта вельмі цяжка. Але на дапамогу прыходзяць рускія студэнты і студэнты замежных краін са старэйшых курсаў, выкладчыкі...

Кубінскі студэнт Лгйва Антоніо вельмі хвалюецца, нерашуча бярэ экзаменацыйны білет па хіміі, чытае і... твар яго прасвятляецца. Так, гэтыя пытанні ён ведае добра. Студэнт адказвае ўпэўнена, правільна гаворыць па-руску, і можна заўважыць, што ён адчувае задавальненне ад свайго адказу. Заканчвае і пытае выкладчыкаў: «Я маладзец?» Так, мы згодны: Антоніо — маладзец.

Яму было вельмі і вельмі цяжка займацца на падрыхтоўчым факультэце. Пасля заканчэння школы некалькі гадоў працаваў, а затым прыехаў у СССР. Яму нялёгка давалася руская мова. Прышлося многа працаваць. Часамі можна было заўважыць, як ён адчайваўся, калі з'яўлялася няўпэўненасць у сваіх сілах. Але побач былі сябры, якія дапамагалі Антоніо добрымі парадамі. І Антоніо пачынаў працаваць з новай, яшчэ большай энергіяй. Дзякуючы сяброўскай дапамозе таварышаў і выкладчыкаў, ён паспяхова закончыў падрыхтоўчы факультэт.

Н. ЧУМАКОВА,
ст. выкладчык хіміі.

КРАСАМОЎСТВА ЛІЧБАЎ

У дружнай сям'і студэнтаў універсітэта на працягу многіх гадоў навучаюцца замежныя студэнты. Кантынгент іх значна павялічыўся з адкрыццём ва універсітэце ў 1961 годзе падрыхтоўчага факультэта.

За шэсць гадоў, прайшоўшых з таго часу, факультэт падрыхтаваў каля 600 замежных студэнтаў, якія зараз працягваюць вучобу па спецыяльнасці ў вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах СССР.

У гэтым навучальным годзе на падрыхтоўчым факультэце навучаецца 129 в'етнамскіх студэнтаў.

На фізічным, хімічным, біялагічным, матэматычным, філалагічным і геаграфічным факультэтах універсітэта навучаецца зараз 88 студэнтаў, 7 аспірантаў і 5 стажораў з розных краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

У 1966—1967 навучальным годзе асноўныя факультэты закончылі 8 кубінскіх і 38 в'етнамскіх студэнтаў. 14 выпускнікоў атрымалі дыпломы выдатнікаў вучобы. Усе яны зараз працуюць у сваіх краінах, актыўна ўключыліся ў будаўніцтва новага жыцця.

У апошнія гады кантынгент замежных студэнтаў і аспірантаў прадстаўлен больш чым 30 краінамі свету.



Цяжкі першы крок.
Фота Я. Данілава.

ВЫХАВАННЕ СТАЛАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Жыццё падказвае, што выкладанне грамадскіх навук, асабліва філасофіі, неабходна праводзіць з абавязковым улікам профілю факультэта. Калі выкладчык філасофіі, акрамя свайго прадмета, глыбока вывучае вядучы прадмет факультэта і ў лекцыях раскрывае палажэнні філасофіі, заснаваныя на яго матэрыяле, удэнты не толькі паспяхова засвойваюць філасофскія тэмы, але і вучацца самастойна абагульняць факты, глыбей авалодваць дыялектычным метадам мыслення.

З другога боку, мы патрабуем ад выкладчыкаў агульнатэарэтычных і спецыяльных дысцыплін, каб яны не абмяжоўваліся выкладаннем фактаў і навуковых палажэнняў, але давалі б філасофскае, марксісцка-ленінскае іх асэнсаванне. З гэтай мэтай для географаў, хімікаў, фізікаў, біёлагаў у нас арганізаваны тэарэтычныя семінары па філасофіі.

Бадай, адно з самых назрэнных пытанняў — як даць, каб будучы спецыяліст творча, а не шкалярскі авалодаў марксісцка-ленінскай тэорыяй. Ёсць першакрыніцы — сканцэнтраванне думак класікаў рэвалюцыйнай навукі. Ці кожны студэнт звяртаецца да іх? Ці ўмее працаваць над імі? Можа абмяжоўваецца запісамі лекцый і падручнікам? Мы стараемся як мага часцей практыкаваць студэнцкія даклады на семінарах. Падрыхтоўка іх патрабуе грунтоўнай працы, выкарыстання разнастайнай літаратуры, развівае навыкі самастойнага аналізу і творчага мыслення.

Гэтаму ж служыць сетка навуковых гурткоў, якую мы пашыраем год ад года. Тут студэнты даследуюць некаторыя праблемы грамадскіх навук. У 1966—1967 навучальным годзе на рэспубліканскі агляд было прадстаўлена 180 студэнцкіх работ. На Усесаюзны агляд па праблемах грамадскіх навук, міжнароднага маладзёжнага руху і гісторыі ВЛКСМ прайшло дваццаць работ нашых студэнтаў. У цяперашнім навучальным годзе на рэспубліканскі агляд прадстаўлена 198 работ.

Напэўна, не ўсе аўтары гэтых студэнцкіх даследаванняў стануць вучонымі, але важна іншае: ідэйная упэўненасць у іх выпрацоўваецца на аснове глыбокіх ведаў. Тэарэтычныя палажэнні яны бяруць не ў гатовым, «канчатковым» выглядзе, а ідуць да іх шляхам пошуку, вялікай творчай работы. Вось таму і мацней гэтыя веды. Вось таму і становяцца яны ўнутраным перакананнем юнакоў і дзяўчат.

Пры вывучэнні новага матэрыялу ў студэнтаў часта ўзнікаюць розныя пытанні, з якімі яны, вядома, звяртаюцца да выкладчыкаў. Партыйная арганізацыя сочыць за тым, каб лектары і кіраўнікі семінараў ні ў якім разе не адыходзілі ад адказаў на такія пытанні, цярпліва і поўна, праўдзіва і пераканаўча тлумачылі моладзі ўсё тое, што іх цікавіць. Адкрыта, з марксісцка-ленінскіх пазіцый раскрываючы цяжкія і вострыя праблемы, выкладчык уносіць яснасць у погляды студэнта, прывучае яго смела глядзець праўдзе ў вочы, рашуча выступаць за праўду, калі на яе хто-небудзь паквапіцца.

Светапогляд студэнта выхоўваецца не толькі на лекцыях і семінарах. Яго погляды на жыццё фармуюцца ўсім укладам на аснове ўсёй нашай рэчаіснасці, усім акаляючым асяроддзем. Партыйная арганізацыя універсітэта імкнецца да таго, каб гэтае асяроддзе садзейнічала выхаванню ў студэнтаў лепшых грамадзянскіх якасцей.

Рэгулярна партыйныя групы, факультэцкія партыйныя арганізацыі абмяркоўваюць работу выкладчыкаў са студэнтамі ў вольны ад вучобы час. Выкладчык — не госць у пакоі студэнцкага інтэрната, а пастаянны, уважлівы дарадчык і настаўнік.

Да гэтага часу дыскусійным застаецца ў нас пытанне аб куратарах у акадэмічных групах. Мы падыходзім да такога рашэння: замацаваць куратараў толькі за малодшымі курсамі, таму што там большасць студэнтаў — учарашнія школьнікі, якія не маюць навыкаў самастойнай работы, ім некаторы час неабходна паўсядзённая дапамога. Старшакурснікам жа даем большае права на самастойнасць. Навошта апекаваць чалавека, які праз год-два сам стане выхаваўцам?

Урачыстыя вечары, прысвечаныя знамянальным датам, мы стараемся праводзіць з выдумкай, так, каб яны надоўга засталіся ў памяці ўдзельнікаў. Змястоўна і цікава прайшлі, напрыклад, напярэдадні 50-годдзя Савецкай улады вечары на тэмы: «Вялікі Кастрычнік і моладзь», «Гераізм бацькоў — у спадчыну дзецям», «Гэтых дзён не змоўкне слава», «Горад, у якім ты жывеш» і іншыя. У гасцях у студэнтаў пабывалі многія вядомыя партызанскія кіраўнікі і камандзіры воінскіх часцей, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны.

У юбілейным годзе былі арганізаваны экскурсіі ў Брэсцкую крэпасць-герой, у Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, музей Першага з'езду РСДРП, па месцах гераічнага партыйнага і камсамольскага падполля горада Мінска. Налажваліся дыскусіі і канферэнцыі чытачоў па кнігах, прысвечаных герояцы рэвалюцыі, патрыятызму савецкіх людзей. Паспяхова праведзен турыстскі паход па месцах працоўнай і баявой славы.

Выдатна зарэкамендаваў сябе зводны будаўнічы атрад універсітэта, які складаецца з 47 атрадаў. Ён за свой за час працоўнага семестра сёлетняга юбілейнага года больш мільёна рублёў капіталаўкладанняў. На цаліне сіламі нашых студэнтаў пабудаваны пасёлак Юбілейны. 18 аб'ектаў узведзена ў Беларусі. Але справа не толькі ў гэтай матэрыяльнай аддачы. У працоўным семестры ўдзельнічала звыш чатырох тысяч студэнтаў універсітэта, і кожны з іх прайшоў добрую школу калектыўнай працы.

Працуючы на будоўлях, прадпрыемствах, у калгасах, у навучальных установах, размаўляючы з рабочымі, калгаснікамі, студэнты праходзяць таксама своеасаблівую школу палітычнай і маральнай сталасці. Каб такія кантакты былі не толькі ў перыяд працоўнага семестра, але і на працягу ўсяго года, партыйная і камсамольская арганізацыі замацоўваюць і развіваюць сувязі універсітэта з калектывамі прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, навучальных устаноў, у якіх мы пастаянна праводзім палітыка-выхаваўчую работу.

Студэнцкая сям'я ва універсітэце вельмі вялікая. Ахапіць агульнымі мерапрыемствамі ўсіх без выключэння нялёгка. У такіх умовах асабліва важнай з'яўляецца роля партыйных і камсамольскіх груп, якія могуць трымаць на ўвазе кожнага студэнта «па-асобку». Мы абмяркоўвалі гэтае пытанне на агульнаўніверсітэцкім партыйным сходзе і вызначылі шэраг канкрэтных мер для павышэння выхаваўчай ролі партгруп. Партыйны камітэт цяпер больш уважліва сочыць за іх дзейнасцю, аказвае дапамогу партгрупам, вывучае і распаўсюджвае лепшы вопыт.

Камуністы універсітэта добра разумеюць, што брак у нашай рабоце ні ў якім разе не павінен дапускацца. З вну павінны выходзіць спецыялісты высокай кваліфікацыі і высокай ідэйнай перакананасці. Да гэтага накіраваны нашы намаганні.

Т. ДУДАРАВА,
сакратар парткома універсітэта.

(«Правда», 23 лістапада 1967 г.).

ПРАГРАМА ВЫЗНАЧАНА

ДА ВЫНІКАЎ XXII КАМСАМОЛЬСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

Як ужо паведамляла наша газета, ва універсітэце адбылася камсамольская канферэнцыя. Дэлегаты падвялі вынікі работы ў юбілейным годзе і дэталёва абмеркавалі вялікую праграму дзеянняў надалей. У прыватнасці, канферэнцыя прыняла прапанову В. Максімовіча з фізфака аб далейшым развіцці турысцкага спорту. Многа таксама гаварылася аб абароннамасавай рабоце. Але галоўную ўвагу дэлегаты звярнулі на павышэнне ролі камсамольскіх арганізацый у вучобе і навуковых даследаваннях студэнтаў. Сакратар парткома Т. Дударава, старшыня СНТ Барыс Замскі, супрацоўнік бібліятэкі Аляксандр Рукшын, Юля Гарашчук з філфака, Святлана Осіпава з хімфака, Валянцін Галубовіч з гістфака, сакратар Мінскага абкома камсамола Барыс Путрын і іншыя адзначылі, што камітэт камсамола, факультэцкія арганізацыі павінны аддаваць больш часу рабоце непасрэдна ў групах, на курсах, не выпускаць з поля зроку ні аднаго чалавека.

Канферэнцыя абрала новы склад пленума ў колькасці 53 чалавек. На арганізацыйным пасяджэнні першым сакратаром бюро камітэта выбран Міхаіл Ціва, другім — Анатоль Ляонаў. Члены бюро: Л. Давыдэнка, Г. Цішкевіч, Т. Віннікава, М. Шавыркін, Я. Котаў, У. Самсановіч, М. Бондар, І. Шынгель і В. Прокашава.

К. СІДАРОВІЧ.



На здымку: студэнты другога курса фізічнага факультэта Аскар Рабіновіч і Юлія Раманоўскі вызначаюць сілу электрычнага току. Сесія ж, як кажуць, не за гарамі.

Фота І. Аскіркі.

На універсітэцкай арбіце

ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ

Імя вялікіх вучоных

Прэміі імя выдатных айчынных вучоных, якія заклалі асновы цэлых галін навукі, прысуджаюцца лепшым прадаўжальнікам іх ідэй, аўтарам выдатных даследаванняў. Нядаўна ў наш універсітэт прыйшла радасная вестка: акадэміку АН БССР прафесару Т. Н. Годневу прысуджана прэмія К. А. Ціміразева 1967 года за манаграфію «Хларафіл, яго будова і ўтварэнне ў расліне».

Заслужаная ўзнагарода

За актыўную навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з 70-годдзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Ганаровай Граматай прафесара кафедры глебазнаўства Андрэя Рыгоравіча Мядзведзева.

Горача віншуем нашага старэйшага вучонага і педагога з заслужанай узнагародай!

Госці з Польшчы

З вялікім поспехам прайшоў спектакль «Містэрыя-буф» у выкананні польскага студэнцкага тэатра «Цытрына» з Лодзі, які выступаў ва універсітэце.

Гледачы-студэнты і выкладчыкі з вялікім задавальненнем успрынялі майстэрскую ігру польскіх студэнтаў.

Паездка ў ГДР

Студэнтка другога курса БДУ Н. Захарава ў складзе дэлегацыі калектываў мастацкай самадзейнасці вышэйшых навучальных устаноў Мінска пабывала ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Савецкія артысты-аматары выступілі ў гарадах Майнінген, Гера і іншых, а таксама зрабілі экскурсію па горадзе Берліне.

Нядаўна Наташа вярнулася ў Мінск. Сваімі ўражаннямі аб паездцы яна падзялілася з аднакурснікамі.

СТЭМ рыхтуецца да дэбюту

У актавай зале ўсяго некалькі чалавек. Яны яшчэ не ведаюць адзін аднаго, таму што вучацца на розных курсах, розных факультэтах. Але адзінае жаданне ўдзельнічаць у студэнцкім тэатры эстрадных мініятур прывяло іх сюды.

Кіраўнік тэатра Уладзімір Блахін коратка расказаў аб задачах, якія стаяць перад СТЭМам.

— Тэматыка праграмы нашага тэатра — выключна студэнцкая: высмейванне ўсіх недахопаў. Выступленні павінны быць у выглядзе кароткіх мініятур, выкананых па-майстэрску, з гумарам.

На першай рэпетыцыі выступілі Б. Герстэн, Б. Саглаеў і іншыя студэнты.

Малады тэатр пачаў дзейнічаць. Хутка мы будзем сведкамі яго першага выступлення.

Летапіс жыцця

На першым курсе факультэта журналістыкі выходзіць насценная газета «Слова». Яна адлюстроўвае вучобу, грамадскае жыццё і адпачынак першакурснікаў.

Поруч са «Словам» будучыя журналісты выпускаюць альманах «Летапіс». Гэта своеасаблівы летапіс жыцця курса. У альманаху знаходзяць месца матэрыялы аб самых важных і найбольш цікавых падзеях, якія адбываюцца на курсе.

Калі зойдзеш у студэнцкі інтэрнат № 4, які знаходзіцца на Паркавай магістралі, цябе абавязкова сустрэнуць у вестыбюлі дзяжурныя студэнты.

НА ЗДЫМКУ: студэнткі чацвёртага курса матэматычнага факультэта Наташа ПОЛАЎЦАВА і Таццяна АРЛОВА толькі што пачалі дзяжурыць.

Фота І. АСКІРКІ і В. ОЗЕРАВА.

У СВЕЦЕ ЦІКАВАГА

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ

Больш года назад друк паведамляў аб знойдзеным вялізным могільніку павергнутых дубоў. Скапленне выкапневых дрэў-гігантаў знаходзілася ў 90 кіламетрах ад Мінска ў пясчана-гравійных кар'ерах драбільна-сартавальнага завода «Смаргонь». Сотні ствалоў, пачарнеўшых ад часу і вільгаці, ляжалі абыякава на дзесятках гектараў у пясчаных наносах Віліі на глыбіні 2—8 метраў. Што гэта — вынік старажытнай катастрофы ў прыродзе?

Адказ на гэтае пытанне далі вучоныя. Дацэнты кафедры агульнай геалогіі геолага-геаграфічнага факультэта БДУ Л. Н. Вазнячук і В. В. Шчыглова падвялі вынікі сваіх працяглых даследаванняў незвычайнага прыроднага музея. Яны ўстанавілі, што накапленні моранага дубу былі ўтвораны ў адкладах поймы Віліі на працягу некалькіх апошніх тысячагоддзяў. Рака рэгулярна падмывала берагі і пахавала ў сваіх наносах ствалы магутных дрэў.

Гэтыя з'явы пачаліся ў самым цёплым перыядзе пасля ледніковага часу— 6—7 тысяч гадоў назад. Некаторыя са знойдзеных ствалоў дубу зусім «маладыя». Яны рухнулі ў ваду каля тысячы гадоў назад.

Прырода прыпаднесла ў гэтым жа месцы яшчэ адну нечаканасць. Пры раскрыцці ніжняга «паверху» рачных наносаў, які ляжыць пад скапленнем дрэў, на глыбіні 8—10 метраў знойдзен яшчэ адзін могільнік вымершых жывёл, звесткі аб якіх маюцца толькі ў навуковай літаратуры. Яны, як устаноўлена, знаходзіліся тут у часы апошняга, «Валдайскага» абледзянення і раней.

Выключную цікавасць прадстаўляе знаходка двух чэрапаў мускуснага авечкабыка. Нашчадкі гэтых жывёл цяпер водзяцца толькі ў свабоднай ад лёду паўночнай частцы Грэнландыі і на арктычных астравах Канадскага архіпелага. Знойдзены тут і абломкі рога паўночнага аленя, зубы і косці маманта, косці шарсцістага насарога, гіганцкага, ці вялікарогага, аленя (разгон рог больш, чым два метры). Усе гэтыя жывёліны насялялі тэрыторыю Беларусі ў тыя часы, калі паўночныя раёны яе былі скаваны моцным панцырам апошняга ледніковага пакрыцця.

Але самай дзіўнай была знаходка тут касцей больш старажытных жывёл, існаваўшых у мінулую эпоху. Палеантолаг В. В. Шчыглова знайшла косці каня, якія напамінаюць зебрападобнага каня Сценона і своеасаблівага насарога. Сярод нага пітэкантропа. Сярод знаходак маюцца таксама косці маленькага каня, падобнага на тых, якія пасвіліся на прасторах Паволжа перад надыходам самага вялікага ледніка — Дняпроўскага, пакрыўшага вялікую частку рускай раўніны. Касцяныя астаткі з адкладаў «пра-Віліі» маюць абсалютны ўзрост не менш 18—20 тысяч гадоў. Астаткі жывёл ніжняга гарызонта і таго старэй — больш ста тысяч гадоў.

Своеасаблівы прыродны музей, на «полках» якога сабраны гэтыя экспанаты, унікальны для ўсяго захаду Савецкага Саюза. Частка знойдзеных астаткаў перадана ў геалагічны музей Беларускага дзяржаўнага універсітэта, частка — у Дзяржаўны музей БССР. Вучоныя універсітэта працягваюць свае даследаванні і пошукі пад Смаргонню.

С. РАТГАЎЗ.



ПЕРШЫ ЛЁД.

Фотаэцюд Я. ЯРМОЛІЧА.

ЖЫХАРЫ АЗЁРНАГА КРАЮ

Сляды найбольш старажытных жыхароў берагоў самага вялікага вадаёма Беларусі — возера Нарач выявілі археолагі Беларусі і студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

У крутым разрэзе берага і ў вадзе былі знойдзены прымітыўныя крэмневыя прылады — разцы, скрабкі, нажы. Установлена, што тут некалі размяшчалася стаянка чалавека старажытнакаменнага веку.

Нарачанская стаянка вельмі падобная да стаянак Прыбалтыкі і Польшчы і так званых Мадленскіх стаянак Паўночна-Заходняй Еўропы.

На барцоўскім дыване

— Раўняйся, смірна! Раўненне на сярэдзіну! Таварыш суддзя спаборніцтваў, барцы вольнага стылю для ўдзелу ў XVI першынстве універсітэта пастроены!..

Мы знаходзімся ў спартыўнай зале універсітэта. Тут адкрываецца агульнакаманднае першынство універсітэта па вольнай барацьбе. Кіруе парадам капітан каманды-пераможцы XV першынства В. Шэйнэман. У двух шарэнгах стаяць 94 спартсмены-студэнты, якія прадстаўляюць розныя факультэты, але адзіныя ў сваёй мэце — перамагчы!

17 гадзін 30 мінут. На дыване першая пара барцоў першага дня спаборніцтваў: Мінін — Сакалоў. Праходзіць усяго адна мінута, а Мінін ужо пераможаны.

Пара за парай выходзіць на дыван. Той, хто праіграў дзве схваткі, выбывае з далейшых спаборніцтваў. Кола прэтэндэнтаў на асабістае першынство ўсе больш звужаецца.

Вельмі цікавым і прыгожым быў паядынак В. Цырліна і Е. Купрына. У першым туры заслужаную перамогу атрымаў Купрын, які пасля двух дзён спаборніцтваў застаўся аснаўным прэтэндэнтам на асабістае першынство ў сваёй вагавай катэгорыі.

Па заканчэнні сустрэчы балельшчыкі апладыравалі і пераможанаму. Цырлін (на здымку ён знізу) прадэманстраваў вялікую волю да перамогі, але ў адносінах тэхнічнага майстэрства ён аказаўся слабейшым. Гэта і прымусіла яго здацца. Але і паражэнне В. Цырліна было ганаровым: ён змагаўся з кандыдатам у майстры спорта.

Што паказалі першыя два дні спаборніцтваў? Вельмі многа слабых, дрэнна падрыхтаваных барцоў. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць сустрэч, якія нават менш, чым праз адну мінуту абрываліся. Трэба сказаць і аб недастаткова дакладным судзействе, асабліва на другі дзень. Яшчэ адна вельмі важная рыса, якая прысутна многім спаборніцтвам: у зале не было відаць кіраўнікоў фізічнага выхавання на факультэтах. Відавочна, выступленні студэнтаў-спартсменаў сваіх факультэтаў іх не цікавяць. А хто ж у першую чаргу павінен быць зацікаўлены ў паспяховым выступленні сваіх выхаванцаў?

Пасля двух дзён паядынкаў на прызавое месца ў агульна-камандным заліку прэтэндуюць тры калектывы: юрыдычнага факультэта (пераможцы XV першынства), матэматычнага факультэта і мясцкома.

Фота і тэкст А. АСТАПАВА.

Люду Кукчанка, студэнтку другога курса матэматычнага факультэта, ведаюць ва універсітэце не толькі як працавітую дзяўчыну, але і як аматара парашутнага спорту.

Нядаўна ў жыцці Люды адбылася радасная падзея: яе залічылі на аддзяленне пілотаў пры Рэспубліканскім клубе ДТСААФ.

На здымку: Люда КУКЧАНКА.

Да нарады маладых пісьменнікаў

У Каралішчавічах адкрылася рэспубліканская нарада маладых пісьменнікаў. У ёй прымаюць удзел і прадстаўнікі нашага універсітэта. Сёння мы друкуем літаратурныя пародыі студэнта Міколы Вяршыніна на тое, як некаторыя старэйшыя пісьменнікі працуюць з маладымі.

На Пятра Валкадаева

Што? Вы аўтар малады?
А я ўжо дваццаць два гады
Тут кансультант стары, нязменны,
І стаў даўно ўжо нязаменным.
А вершы Вам пісаць не раю.
Шлю прывітанне,
Валкадаеў.

На Пятруся Макаля

Яно і тое,
Яно і сёе,
Яно і гэтак,
Яно і так,
У Вашых вершах штось такое,
Што не магу сказаць ніяк.
Сказаць бы прама,
Сказаць бы смела,
Што верш Ваш добры
Ці дрэнны ён,
Ды каб нічога не зразумелі—
Такі ў мяне ва ўсім закон.

На Канстанціна Цітова

Я разумею, безумоўна:
Ваш кожны верш такі цудоўны!
Надрукаваць жа... не магу.

На Міколу Гамолку

Скажу і вечарам і ў ранні:
Па мне хоць не расці трава,
Мне сацыяльныя гучанні
У кожным вершы падавай.
Няма гучання—быць бядзе!
Не надрукую у «Звяздзе».

На Сяргея Дзергая

Калі паэт ты малады —
Спушчу тры шкуры я тады,
А пра старэйшых так мяркую:
Нясі што хочаш— надрукую.



ЗНОЎ СПЕКТАКЛЬ

У сераду студэнцкі маладзёжны тэатр у другі раз выступіў перад універсітэцкімі гледачамі з новым спектаклем «Маладая гвардыя». Рэжысёр — заслужаны артыст Латвійскай ССР А. М. Озераў.

Рэдактар М. І. Іоська

Зак. 1858. АТ 23224 Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. № 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».